ПАДЗЕЯ

# ГроднаЛітЭкспа-2024

**16 сакавіка 2024 года дэлегацыя Гродзенскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі выступіла на XXXI Мінскай міжнароднай кніжнай выставе-кірмашы.**




На галоўны кніжны форум Беларусі ў рэспубліканскі выставачны цэнтр «БелЭкспа», акрамя ўласных кніг і твораў, прадстаўнікі літаратурнай Гродзеншчыны прывезлі цеплыню сваіх сэрцаў і святло, а дакладней, водсвет – «Водсвет далёкіх дзён». Такую назву атрымала прэзентацыя творчасці абласной пісьменніцкай арганізацыі, якая сёлета была прысвечана 80-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і 90-годдзю ўтварэння Саюза пісьменнікаў Беларусі. У склад літаратурнай «каманды» Прынёмання ўвайшлі: Людміла Кебіч (паэтэса, празаік, кіраўнік дэлегацыі), Браніслаў Ермашкевіч (паэт), Ліна Багданава (празаік), Таццяна Сучкова (дзіцячая пісьменніца), Кацярына Каламійцава (паэтэса), Дзмітрый Радзівончык (паэт, публіцыст), Уладзімір Ягорычаў (публіцыст), Мікалай Іваноўскі (паэт, Ваўкавыскі раён), Таццяна Яцук (паэтэса, Навагрудскі раён).

Знаходжанне дэлегацыі Прынёмання на XXXI Мінскай міжнароднай кніжнай выставе-кірмашы пачалося з прыемнага моманту. Адразу пяць гродзенцаў сталі пераможцамі Нацыянальнага конкурсу рукапісаў (які чамусьці мае англійскую назву) «ЛітАп». Шчасліўчыкамі гэтага года сталі Людміла Кебіч, Таццяна Сучкова, Ліна Багданава (СПБ), Ірына Салата (па стане на 16.03.24. кандыдат у СПБ) і малады, перспектыўны аўтар Андрэй Дарожкін. Гэтыя нашы калегі ўбачаць свае рукапісы ў выглядзе кніг, выдадзеных у дзяржаўных выдавецтвах, ужо сёлета. Сардэчна віншуем. 5 пераможцаў з 19 фіналістаў – для Гродзенскай вобласці гэта выдатны, рэкордны вынік! Па праву ганарымся. Нагадаем, што ў мінулагоднім конкурсе «ЛітАп» таксама перамаглі нашы калегі па абласной пісьменніцкай арганізацыі – паэтэса Вікторыя Смолка і празаік Кацярына Насута (іх кнігі пакуль не выйшлі, чакаем). Падчас урачыстага фіналу спаборніцтва кожны з аўтараў-фіналістаў меў магчымасць

выступіць на галоўнай сцэнічнай пляцоўцы з прэзентацыяй сваёй будучай кнігі, сфармуляваць яе асноўную ідэю, пазнаёміць з формай увасаблення аўтарскай задумы і кароткім зместам, прапанаваць спосабы прасоўвання (раскруткі) новай кнігі.



З прэзентацыяй уласнага творчага праекта выступае член СПБ, пісьменнік-педагог Ліна Багданава (Г. А. Богдан)


Пераможцы Нацыянальнага конкурсу рукапісаў «ЛітАп» - 2024 і яго арганізатары




**Сярод пераможцаў Нацыянальнага конкурсу рукапісаў «ЛітАп» - 2024 – пісьменнікі з Гродна: Ліна Багданава, Людміла Кебіч, Таццяна Сучкова і Андрэй Дарожкін**

Як вядома, Мінская міжнародная кніжная выстава-кірмаш – гэта заўсёды не толькі кнігі. Але яшчэ і цікавыя знаёмствы, сустрэчы з чытачамі, выдаўцамі і вядома, з сябрамі.




**Павільён навуковай бібліятэкі ГрДУ імя Янкі Купалы. Дзмітрый Радзівончык са зборнікам «Рэспубліканскія Купалаўскія чытанні» (2023)**




**Павільён СПБ. Крайні з левага боку – вядомы паэт, дзіцячы пісьменнік Уладзімір Мазго (Мінск)**



**Людміла Кебіч у кампаніі дыпламата, беларускага паэта, аўтара і выканаўцы песень Аляксандра Авяр'янава і яго супругі Алены Эдуардаўны**

Па традыцыі ў выставачным комплексе «БелЭкспа» размясціліся павільёны дзясяткаў айчынных і замежных выдавецтваў, адначасова праходзіла мноства мерапрыемстваў, галоўнымі ўдзельнікамі якіх былі кнігі, аўтары, выдаўцы, крытыкі, бібліятэкары і вядома, чытачы. Праграма XXXI Мінскай міжнароднай кніжнай выставы была настолькі насычанай і разнастайнай, што гродзенскім літаратарам выпала выходзіць на сцэну адразу пасля канцэрта Вялікага тэатра оперы і балета Рэспублікі Беларусь. Можна колькі заўгодна жартаваць на гэты




конт, але вопыт паказаў надзвычайную важнасць сцэнічнай працы сучаснага літаратара з публікай, удасканаленне навыкаў рыторыкі, культуры падачы матэрыялу ў фармаце адкрытага дыялогу. Галоўная сцэна была аформлена ў выглядзе панарамы знаёмага кожнаму беларусу месца – сталічнай Плошчы Перамогі, упрыгожанай жывымі кветкамі, чырвонымі цюльпанамі. Такое дызайнерскае рашэнне абумоўлена асноўнай тэмай XXXI ММКВК – 80-годдзем вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкай акупацыі. Прэзентацыя творчасці літаратурнай Гродзеншчыны насіла рэтраспектыўны, тэматычны

характар. Вядучая творчай праграмы Людміла Антонаўна Кебіч *(на фота вышэй)* па чарзе прадстаўляла выступоўцаў, прэзентавала нашы калектыўныя выданні, распавядала пра літаратурнае жыццё нашага краю і яго асноўныя падзеі, якія адбыліся ў перыяд з мінулагодняй выставы. Нягледзячы на тое, што былі прадстаўлены кнігі, якія выйшлі не толькі сёлета, змест выступлення нашых калег характарызаваўся актуальнасцю і меў шмат яркіх асаблівасцей. Напрыклад, вядомы празаік Ліна Багданава нечакана выступіла з аўтарскім вершам «Огонь памяти». Дзмітрый Радзівончык выступіў як публіцыст і прачытаў у скарачэнні нарыс пра свайго дзеда-франтавіка. Мікалай Іваноўскі агучыў шчымлівы рэквіем спаленым вёскам роднай Ваўкавышчыны і ўсёй Беларусі. У сваіх творах гродзенцы аддалі даніну пашаны подзвігу воінаў-вызваліцеляў, ветэранам Вялікай Айчыннай вайны. Прагучалі прысвячэнні народу Беларусі, мужнаму і непакоранаму ворагам; адзінаму, інтэрнацыянальнаму савецкаму народу – пераможцы фашызму, вобразам спаленых вёсак, матывам Перамогі, непарыўнай сувязі часоў і вечна жывой памяці народнай. Невыпадкова выступленне прынёманскіх гасцей форуму называлася «Водсвет далёкіх дзён». Гэта назва зборніка ваенна-патрыятычнай лірыкі патрыярха сучаснай беларускай паэзіі Гродзеншчыны, 86-гадовага Браніслава Ермашкевіча. Нягледзячы на вельмі сур'ёзны ўзрост, творца знайшоў сілы, каб пераадолець немалы шлях ад Гродна да Мінска і сказаць сваё слова там, дзе айчынныя літаратары адзначаюць светлую юбілейную дату. Дарэчы, Браніслаў Іосіфавіч – аўтар дылогіі (першая кніга прысвячаецца 70-годдзю Перамогі; другая кніга, зборнік вершаў і нарысаў «Памяць патрэбна жывым» выйшла да 75-годдзя вызвалення Беларусі), магчыма самы пажылы ўдзельнік літаратурных выступленняў СПБ на Мінскай кніжнай выставе гэтага года, адносіцца да катэгоры «дзеці вайны». Ён і адкрыў праграму прэзентацыі *(на фота)*.







Мікалай Іваноўскі



Кацярына Каламійцава



Таццяна Яцук



Ліна Багданава



**Дзмітрый Радзівончык**



**Уладзімір Ягорычаў**



**Старшыня ГрАА СПБ Л. А. Кебіч прэзентавала набыткі літаратараў вобласці і міжнародныя, сумесныя з Расійскай Федэрацыяй праекты «Берега дружбы» (Растоўская вобласць) і «На одном языке» (Разань) у рамках ініцыяванай Саюзам пісьменнікаў Беларусі Дэкады рускай кнігі**




Мінская кніжная выстава 2024 года стала гісторыяй. Яна даказала, што сёння літаратура – гэта не толькі мастацтва слова, гэта здольнасць адчуваць подых часу, уменне сябраваць, гарманічна ўспрымаць навакольны свет, рабіць з розных абставінаў правільныя высновы. Гродзенскае абласное аддзяленне Саюза пісьменнікаў Беларусі выказвае падзяку ўсім, хто дапамог удзелу дэлегацыі вобласці ў XXXI Мінскай міжнароднай кніжнай выставе-кірмашы, усім, хто наведаў аўтарскія літаратурныя чытанні і стаў слухачом творчай прэзентацыі «Водсвет далёкіх дзён». Увасобленае ў мастацкім слове, наша мінулае сапраўды здольна высвятляць самыя важныя дэталі жыцця сённяшняга – вернасць гістарычнай праўдзе і грамадзянскае сумленне нацыі, выхаваўчы прыклад мужнасці і стойкасці салдат Вялікай Айчыннай, неабходнасць яшчэ больш гаварыць на гэтую тэму з моладдзю, несці гэтае сакральнае, чароўнае святло далёкіх дзён у будучыню. Каб яна была светлай.

**САЮЗ ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ**
**Гродзенскае абласное аддзяленне**



***Фота*** *Аляксандра Авяр'янава*